*Прачытаў — перадай суседу!*

# Вольная СЕРАБРАНКА

МЯСЦОВАЯ ГАЗЕТА НЕЗАЛЕЖНАГА ГРАМАДСТВА

№ 2 (14) люты 2009

Макей нарабіў шуму **(старонка 2)**

Колькі каштуе паставіць лічыльнік **(старонка 4)**

Срэбраныя млыны гісторыі **(старонка 5)**

Эсэ Уладзіміра Арлова пра Серабранку **(старонкі 6–7)**

## Нашы ў Радзе

Жыхар Серабранкі, старшыня Таварыства беларускай мовы **Алег Трусаў** запрошаны ў склад Грамадска-кансультатыўнай рады пры Адміністрацыі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У гутарцы з нашым карэспандэнтам спадар Трусаў пагадзіўся падзяліцца сваімі ўражаннямі з гэтай нагоды.

**– Спадар Алег, адбылося першае паседжанне Грамадска-кансультатыўнай рады. Пакуль мала хто верыць, што Лукашэнка змяніўся і пачне нарэшце прыслухоўвацца да носьбітаў альтэрнатыўных меркаванняў.**

– Як мне падаецца, сярод правячай



наменклатуры пачаў праглядацца раскол, як казалі пры Саветах, на "ястрабаў" і "галубоў". Гэтыя дзве плыні ідуць паралельна. Адны – за рэформы, другія, у асноўным, старога пакалення, усім сваім выглядам паказваюць, што рэформы ім "сто гадоў не патрэбныя"...

Адны арыштоўваюць тых жа прадпрымальнікаў, другія хочуць прыняць закон пра выбары. "Ястрабы" нічога не хочуць мяняць... Ад таго, які бок пераможа, сёння залежыць лёс краіны. Што да выказвання Лукашэнкі, то ён, відавочна, на баку прадстаўнікоў старой наменклатуры. І яму маладыя – новая плынь – наступаюць на пяткі... З другога боку, ён ужо не можа кіраваць па-старому.

Таму, можна сказаць, што перабудова,

працяг на с. 2




АРТУР ЛАГОДНЫ

## Чым зойме служба занятасці?

Як дзяржава апякуецца грамадзянамі, якія з тых ці іншых прычынаў страцілі працу і адпаведна адзіную крыніцу сродкаў для існавання, даследуе наш карэспандэнт.

### Даведку атрымае кожны

Дзверы аддзела працаўладкавання "Ленінскі", што месціцца па пр. Ракасоўскага, 49 ля прыпынку "Шэпічы", адчыненыя для ўсіх жадаючых у кожны будні дзень. Любы наведвальнік, незалежна ад таго, стаіць ён на ўліку як беспрацоўны ці не, можа азнаёміцца з наяўнымі вакансіямі на рынку працы і іншай інфармацыяй, датычнай далейшага працаўладкавання. Гэта ў тым выпадку, калі беспрацоўны разлічвае на ўласныя сілы. Менавіта так рабіла большасць з двух дзесяткаў наведвальнікаў, якія, дачакаўшыся чаргі да аднаго з чатырох камп'ютэраў з базай дадзеных пра вакансіі, занатоўвалі неабходную інфармацыю ў свае нататнікі.

### Што дае афіцыйны статус

Паводле афіцыйнай інфармацыі, супрацоўнікі аддзела працаўладкавання рэгіструюць беспрацоўных і вядуць улік грамадзян, якія звяртаюцца па пытаннях працаўладкавання, садзейнічаюць у пошуку і падборы працы і працаўладкаванні, прымаюць рашэнне пра аказанне дапамогі па беспрацоўі (ад адной базавай – 35 тысяч), як у перыяд атрымання выплаты па беспрацоўі, так і пасля ягонага сканчэння. Аддзел працаўладкавання накіроўвае на грамадскія працы, прапануе вольныя працоўныя месцы і жыллё ў гаспадарках рэспублікі, садзейнічае ў арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці, кансультуе беспрацоўных, як па пытаннях заканадаўства пра занятасць насельніцтва, так і пры адкрыцці ўласнай справы.

працяг на с. 3

ІНСПЕКЦЫЯ

# Макеева перамога

Кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей 4-га лютага знянацку праінспектаваў адміністрацыю Ленінскага раёна, ЖЭС-4 і разлікова-касавы цэнтр ЖРЭА нашага раёна.

**Артур Лагодны**

Вядома, калі настроены шукаць парушэнні – заўсёды іх знойдзеш. Макей, выглядае на тое, меў перад сабой канкрэтную творчую задачу – на дзень ператварыцца ў суворага супрацоўніка Камітэта дзяржкантролю.

Прыбліжанаму да Лукашэнкі чыноўніку ў той дзень усё было не даспадобы: і стэнды не так аформлены, і шрыфт занадта дробны, і “адно акно”, як на бяду, у прысутнасці суворага кантралёра было зачынена, бо супрацоўніца адышла на хвілінку па патрэбах. Канечне, былі заўважаны пэўныя парушэнні справаводства: журнал уліку наведвальнікаў не заўсёды дбайна запаўняўся. Але ж, пагадзіцеся – галоўнае, рэальныя справы, а не фармальны падыход. Чалавеку значна важней, калі яго праблему выслухалі і надалі канкрэтную дапамогу, чым запіс ягонага візіту ў нейкі журнал.

Адзін калега-чыноўнік апаратыўна падмяніў адсутнага, каб пайсці насустрач людзям і не адмяняць прыём грамадзян. І тут дапытлівы Макей убачыў парушэнне: маўляў, у графік наведвання не былі ўнесены змены. Пасля макеевай інспекцыі па кабінетах адміністрацыі Ленінскага раёна яе кіраўнік Аляксандр Барысенка адразу пагадзіўся сустрэцца з высокапастаўленым чыноўнікам і выслухаць усе яго заўвагі.

Калі лукашэнкаўскі чыноўнік наведаў ЖЭС-4, што на Энгельса, 32, і не заспеў там дырэктара, яго абурэнню не было межаў. Кіраўнік прадпрыемства на наступны дзень вымушаны быў звольніцца. Як высветлілася, у той нешчаслівы дзень дырэктара ЖЭСу выклікалі на вул. К. Марка, адкуль паступіла скарга на непрыбраныя пад’езды. Супрацоўнікі арганізацыі сумуюць па былым кіраўніку, які добра ведаў раён і сумленна працаваў на сваёй пасадзе. “Навошта было звальняць? Трэ было разабрацца. Усе ж жывыя людзі”, – кажа дыспетчарка ЖЭС-4.


PHOTO.BYMEDIA.NET

У разлікова-касавым цэнтры на Свярдлова, 19 увогуле адбылася анекдатычная сітуацыя. Супрацоўнікі ўстановы, каб у поўнай меры забяспечыць правы грамадзян на атрыманне інфармацыі, выклалі копіі амаль усіх нарматыўных дакументаў, якія могуць закранаць інтарэсы наведвальнікаў. Гэты, што праўда, падобны да “салянкі”, ладны стос папер зноў жа выклікаў раздражненне кіраўніка прэзідэнцкай адміністрацыі.

Як вядома, рыба псуецца з галавы. Было б вельмі добра, каб спадар Макей звярнуў увагу на арганізацыю работы сваёй адміністрацыі, альбо праінспектаваў працу выбарчых камісій падчас адпаведных кампаній, ці міліцыі і судоў, калі яны караюць актывістаў за палітычныя перакананні, альбо ўрэшце сканцэнтраваў свае намаганні на арганізацыі працы кансультацыйнай Рады пры Адміністрацыі прэзідэнта, каб найхутчэй знайсці шляхі выхаду з эканамічнай рэцэсіі, якая, на жаль, абяцае быць працяглай.

ДЫЯЛОГ

# Нашы ў Радзе

пачатак на с. 1

... як у часы Гарбачова, хоць і пакрысе, але пачалася. Гэта аб’ектыўны працэс.

**– Ці ёсць хаця б адзіны шанец, што Вашыя прапановы будуць улічаныя Радай, ці змогуць уплываць рашэнні Рады на ўрад?**

– Цяжка пакуль сказаць. Адбылося толькі ўстаноўчае паседжанне. Калі лічыць па складзе Рады, то сярод 29 чалавек, якія ў яе ўваходзяць, прадстаўнікоў наменклатуры значна больш. Шмат будзе залежыць ад таго, як падзеліцца наменклатура. А ўжо далей што будзе – пабачым. Адно магу сказаць: праца і перамовы заўсёды даюць плён. Прыкладам магу назваць паступовае вяртанне роднай мовы на транспарт. А колькі гадоў працы гэта каштавала? Зноў жа, сёння можна нават казку беларускую па тэлефоне замовіць, садкі беларускія, хаця і адзінкавыя, але вяртаюцца. А там, дзе сем’і ў дзетак расейскамоўныя, у дзіцячых садках робяць, як у нашай Серабранцы, беларускі дзень.

**– Якія пытанні спадзеяцеся вырашаць з дапамогай Рады?**

– Тыя ж, якімі займаюся ўжо доўгі час. Боль выклікае жахлівы стан нашай першай дзяржаўнай мовы, мовы тытульнай нацыі, як у адукацыі, так і на дзяржаўных радыё і тэлебачанні. І надзея на выпраўленне гэтага становішча ў мяне ёсць.

**– Дзякуй. І поспехаў Вам у далейшай працы.**

**Гутарыў Юрась Навіцкі**

***«… Добра. Хай будзе гэтая Рада. Прыходзьце, размаўляйце, уносьце прапановы. Але калі нехта думае, што гэта будзе парламенцкая трыбуна, каб узнімаць гвалт, прасоўваць брудныя ідэі, то гэтага не будзе. Што вялікага, што новага сказала вам апазіцыя? Для мяне – нічога».***

*(З выступу А.Лукашэнкі 10-га лютага ў Лідзе)*

ПОШТА РЭДАКЦЫІ



АРТУР ЛАГОДНЫ

# Небяспечная пляцоўка

Пляцоўка знаходзіцца недалёка ад прыпынку «Шэпічы» на іншым баку ад крамы «Палессе», яе можна ўбачыць проста праязджаючы ўздоўж праспекту.

Мне здаецца, яе зрабілі летась для «паказухі», бо яна не схаваная ў дварах, дзеткі дыхаюць забруджаным аутамабілямі паветрам. На пляцоўцы замест пяску насыпалі камянёў, гэта небяспечна, таму што там ёсць вялікая и маленькая горкі. Менавіта там мая дачка звалілася з маленькай горкі і стукнулася ілбом аб камяні. Калі б там быў пясок, не было б так страшна, а ўбачыўшы добры сіняк, я вырашыла звярнуцца ў лякарню. Там мы падхапілі моцную інфекцыю і трапілі ўжо ў іншую лякарню. Дзякаваць Богу, урэшце ўсё абышлося.

З іншага боку, я і сама вінавата ў тым, што недагледзела дзіця, бо гутарыла ў гэты момант з іншай матуляй. Але ж існуюць выпадкі, калі дзеці падаюць проста на калені. Тады лепей, каб быў пясок пад нагамі.

**Ала Асадчая**

УДАКЛАДНЕННЕ

# Пра паліклініку

У папярэднім нумары “ВС” быў размешчаны каментар галоўнай медычнай сястры паліклінікі № 23 Святланы Зылевай. У матэрыяле вялося пра тое, чаму не хапае персаналу ў дзяржаўных лякарнях, пра прычыны вялізных чэргаў на прыём да спецыялістаў і праблемы з капрамонтам медычнай установы.

Адказная асоба патрабавала дэзавуяваць фразу: “Святлана Зылева прызнала, што ў паліклініку не вельмі ахвотна ідуць працаваць маладыя спецыялісты”, а таксама акцэнтавала ўвагу на тым, што сітуацыя ў 23-й паліклініцы за апошні год істотна палепшылася. Спадарыня Святлана таксама прасіла не лічыць яе словы, надрукаваныя ў “ВС” № 1, афіцыйным каментаром.




МАЛЮНАК ЮРАСЯ НАВІЦКАГА

Карыстаючыся момантам хочам адзначыць, што ў подпіс да фота ў “ВС” №1 закралася невялічкая памылка. Сайдынгам абшыты не ганак 23-й паліклінікі, як пісалася, а яе ўваход. Спадзяемся, што ўважлівы чытач убачыў сутнасць рэчаў, прыгледзеўшыся да фота.

# І добрых людзей

Рэдакцыя таксама не можа ўстрымацца, каб не выказаць словы замілавання канс’ержцы дома № 4 па вул. Якубава. Інтэлігентная, тактоўная жанчына сустракае жыхароў і гасцей дома шчырай усмешкай, ад якой робіцца цёпла на душы. Яна з лёгкасцю размаўляе на сакавітай роднай мове і з задавальненнем чытае раённую незалежную прэсу :). Пра гэта асабліва варта было напісаць тут, улічваючы маленькае непаразуменне, якое здарылася ў гэтым доме напачатку студзеня, пра якое пісалася ў “ВС” № 8 за 2008 год.

ПРАЦА

# ...Служба занятасці

пачатак на с. 1

## Інфармацыя перадусім

У распараджэнні беспрацоўнага агульнагарадскі банк вакансій і прадпрыемстваў усіх формаў уласнасці. У газеце “Работа для Вас”, якая ў цэнтры занятасці прапануецца бясплатна, можна азнаёміцца з вакансіямі на рынку працы, інфармацыяй службы занятасці (напрыклад, з пералікам штомесячных курсаў прафадукацыі, тэрмін навучання на якіх уключаецца ў агульны працоўны стаж), можна пакінуць для публікацыі свае рэзюмэ. У лютым прафадукацыя прапануецца недзе па двух дзесятках спецыяльнасцяў з гарантыяй працаўладкавання. Ёсць у газеце і з сотню платных курсаў па падрыхтоўцы спецыялістаў.

## Чалавечы падыход і сістэмны

Што ж да маральнай падтрымкі, то маючы размовы з двума інспектарамі аддзела, не магу не падзяліцца прыемным уражаннем: жанчыны спачувальна паставіліся да праблемы страты працы і сапраўды зрабілі захады, каб яе вырашыць. І добра, калі пытанні працаўладкавання насельніцтва будуць вырашацца не фармальна, а прафесійна, і з душою. А вось дзяржаўную матэрыяльную дапамогу ў 12 даляраў інакш як здзекам не назавеш.



**Юрась Навіцкі**

ГАСПАДАРКА

# "Залаты" лічыльнік

**Жыхарам старых дамоў, якім не пашэнціла з капрамонтам, калі вадамеры ўсталёўваюцца бясплатна, давядзецца выдаткаваць са свайго бюджэту на ўстаноўку прыбораў індывідуальнага ўліку спажывання вады ледзь не паўмільёна(!) рублёў.**

Такіх небаракаў у Серабранцы нямала. Паводле дадзеных ЖЭС-41, на яе падведамаснай тэрыторыі колькасць кватэраў, дзе ўжо ўсталяваныя лічыльнікі, дасягае толькі 70% (афіцыйна па краіне гэтая лічба складае 94%).




### Як? Дзе? Калі?

Жадаючыя ўсталяваць прыборы ўліку вады мусяць падаць заяўку ў ЖЭС на абследаванне. Праз дзень-два да вас наведаецца сантэхнік, каб ацаніць стан вашай вадаправоднай сістэмы і прыкінуць аб'ём работаў. Потым замоўца аплочвае работы па ўстаноўцы і з выпіскай квітанцыі чакае сантэхнікаў.

### 100 $ толькі за працу

Зараз каштарыс пераглядаецца, але ў студзені кошт працы па ўсталяванні двух лічыльнікаў (расходу гарачай і халоднай вады) складаў каля 420 тысяч рублёў, а калі яшчэ даводзілася дэмантаваць пральную машыну – усе 450.

Лічыльнікі вады "Струмень" у мінскіх крамах можна знайсці за 70 тыс., аднак ЖЭСы працуюць са сваімі матэрыяламі і абсталяваннем, паколькі нясуць адказнасць за выкананыя работы і за магчымую аварыйную сітуацыю, справакаваную бракам. Чаму за мантаж прыбораў уліку вады ў так бы мовіць сацыяльна арыентаванай дзяржаве дзяржаўныя канторы бяруць ажно 300 тысяч (без кошту лічыльнікаў), незразумела. Можа, у кошт закладзеныя магчымыя рызыкі па кампенсацыі камунальшчыкамі матэрыяльнага ўрону пры, крый Божа, затапленні?

### І падзецца няма куды

Намеснік міністра камунальнай гаспадаркі Генадзь Ляпуноў на сваёй прэс-канферэнцыі 29 студзеня нагадаў, што тыя, хто не ўсталюе індывідуальныя прыборы ўліку вады да траўня, будуць плаціць за ваду і каналізацыю па поўнай праграме.

Мяркуецца, што плата будзе паўтары тысячы рублёў за куб. – у 2 з паловай разы вышэйшая, чым зараз. Пра тое, каб Вы не аплочвалі з траўня нечую нядбайнасць са сваёй кішэні, калі вам выставяць рахунак за ваду, разлітую падчас аварый на магістральных трубах, варта паклапаціцца ўжо цяпер.



АРТУР ЛАГОДНЫ

**ЖЭСы часта ўсталёўваюць лічыльнікі расійскай вытворчасці ў той час, як айчынны "Струмень" пыліцца на паліцах мінскіх гаспадарчых крамаў**

### Добра, калі акупіцца праз гады два

Слоў няма – справа па замене лічыльнікаў даволі клапотная і працаёмістая, але ж кошты сапраўды ўражваюць. Добра, калі ўстаноўка лічыльнікаў акупіцца праз гады два. Можа, такая дарагоўля з-за таго, што апошнім часам дазваляецца ставіць лічыльнікі толькі ў прыбіральнях. Як складана працаваць у маленькіх санітарных вузлах старасавецкай панельнай забудовы, тлумачыць не трэба. Вось і бяруць грошы за працу ў экстрэмальных умовах :). Як бы тое не было, варта думаць пра эканомію ўжо сёння.

**Артур Лагодны**

ПАРТНЁРСКАЯ РЭКЛАМА




Не забывайцеся, шаноўныя чытачы, што pdf-версію вашай газеты магчыма спампаваць у інтэрнэце па адрасе: **http://kamunikat.org/volnaja_sierabranka.html** Адрас сайта газеткі **http://serabranka.at.tut.by** Свае допісы дасылайце, калі ласка, на скрынку **serabranka@tut.by**



# Срэбраныя млыны гісторыі

## Рэйкі, дрожджы, піва


ЮРАСЬ НАВІЦКІ

З’яўленне рабочага пасёлка на паўднёва-ўсходняй ускрайне Мінска, дзе яшчэ захоўвалася драўляная жылая забудова і нерэгулярная планіроўка, было звязана з будаўніцтвам Маскоўска-Брэсцкай (1871) з Брэсцкім вакзалам (цяпер Мінск-Таварны) і Лібава-Роменскай (1873) чыгунак. У 1891–1893 гг. тут з’явіліся два дрожджаброварных заводы – цяпер Мінскі дражджавы камбінат і эксперыментальны электрарамонтны завод. У той час тут працякала рачулка Серабранка, што злівалася са Свіслаччу, а на месцы цяперашняй вуліцы Пляханава знаходзіўся шырокі доўгі яр. Гэты маляўнічы куток (Срэбраныя Млыны) доўгі час служыў месцам адпачынку гараджан. А побач з вёскай Лошыца ўжо тады знаходзіўся старасвецкі сядзібна-паркавы комплекс.


ЮРАСЬ НАВІЦКІ

## Індустрыялізацыя

У пачатку XX стагоддзя на згаданай ускраіне хуткімі тэмпамі пачалося будаўніцтва заводаў, фабрык, майстэрняў і аптовых складоў, з’явіліся буйныя таварныя станцыі. Побач быў пабудаваны яшчэ адзін чыгуначны пасёлак, дзе галоўнаю вуліцаю з’яўляўся Ігуменскі тракт (вуліца Маякоўскага да Дзянісаўскай). Узніклі вуліцы Аранская (траса захавалася, назва паходзіць ад урочышча Араны), Пажарная (захавалася частка вуліцы ля Свіслачы, а назва паходзіць ад існаваўшага каля Чэрвеньскага рынка другога мінскага пажарнага дэпо), Аранжарэйная (захавалася; там знаходзіліся прыватныя парнікі), Надзеінская (захавалася), Безымянная (Палеская), Лугавая (захавалася). У 1908 годзе тут пабудаваны чыгуналіцейны завод “Энергія”, дзе адлівалі дэталі машын і агрэгатаў, агароджы і помнікі. Цяпер гэта адзін з карпусоў Мінскага станкабудаўнічага заводу на вуліцы Кастрычніцкай. На месцы казённага віннага склада цяпер размешчанае аб’яднанне “Мінск-Крышталь”. Усё гэта надавала раёну аблічча індустрыяльнага цэнтру.


ЮРАСЬ НАВІЦКІ

## Назоў стары – месца новае

Новы раён ніжэй па плыні Свіслачы, які пачаў забудоўвацца з 1969-га, вырашылі назваць Серабранкай, і сёння менавіта за гэтым жылым масівам замацаваўся згаданы назоў.

У 1980-х на месцы былой ускраіннай вёскі і пасёлка самазабудоўшчыкаў (аб іх у папярэднім нумары “ВС” распавёў Захар Шыбека), быў створаны адзін з сённяшніх мікрараёнаў Серабранкі – Шэпічы. Дарэчы, Вікіпедыя падае назоў вёскі як Шчэпічы, а на дзвюх сучасных мапах назва мікрараёна прапануецца як Шэйпічы, яшчэ на 2-х – Шэпічы (падобныя назовы мае цэлы шэраг беларускіх месцаў, прыкладам, вёскі ў Пружанскім ці Клецкім раёне). Ад былой вёскі сёння захаваўся хіба што дзесятак дамоў прыватнага сектара на невялічкае вулцы паўночнага захаду раёна. Вулка ж дасюль захавала назоў колішняй вёскі.

## Жыве Серабранка!

У выніку правядзення карэспандэнтам “ВС” невялічкага даследавання, ледзь на поўнач ад стыку вуліц Дзянісаўскай і Ванеева, у лукавіне Свіслачы, знойдзены рэшткі былой вёскі – прамаці сучаснай Серабранкі. Гэта невялікі квартал аднапавярховае прыватнае забудовы, падобны на маляўнічы хутарок-паўвыспу, абмежаваны з трох бакоў ракою Свіслач і прыхаваны з усходу гаражамі і аўтаапраўкай. Замкнёны квадрат вулак складаецца з вуліц Серабранская, Малая Серабранская, Крайняя і завулка Серабранскага ж. Нашыя чытачы лёгка пагодзяцца з тым, што калі б не газаправод ды спадарожнікавыя талеркі, то можна было б казаць: нашая Серабранка часу непадуладная.


ЮРАСЬ НАВІЦКІ

**Юрась Рыжкоў**


АРТУР ЛАГОДНЫ

ПРОЗА

**Колішні жыхар Серабранкі, вядомы беларускі пісьменнік і гісторык Уладзімір Арлоў напісаў больш за трыццаць кніг прозы, эсэістыкі і паэзіі. Сярод іх “Таямніцы полацкай гісторыі”, “Адкуль наш род”, “Ордэн Белай Мышы”, “Час чумы”, “Каханак яе вялікасьці”, “Адкусі галаву вароне”, “Фаўна сноў”, “Краіна Беларусь”, “Паром праз Ля-Манш”, “Сланы Ганібала”, дзе змешчаны нарысы пра Серабранку. Адзін з іх прапануем Вашай увазе на старонках “ВС” з ласкавай згоды аўтара.**

# У нас у Серабранцы*

**Працяг. Пачатак у “ВС” № 2(2008)**

…Так нашая Серабранка апынулася ў сувэрэннай Рэспубліцы Беларусі.

Жыць, праўда, паспалітаму чалавеку стала ня надта каб лепей і весялей. Нават бел-чырвона-белыя сьцягі вывешваць на гаўбцах ужо нецікава, а бэсэсэраўскіх назапасіць у нас у доме не даўмеліся.

Аднак, калі зробіцца зусім сумна, можна схадзіць на нашую пошту. Вось, напрыклад, я хачу даць тэлеграму з сувэрэннага Менску знаёмаму ў сувэрэнны Нью-Ёрк.

— Ні дурыце галаву, — кажа паштарка. — Ні ў какі Нью-Ёркі нікакі ціліграмы ні прынімаім.

— А ў якія-небудзь Наваполацкі якія-небудзь тэлеграмы прымаеце?

— У Наваполацкі прынімаім.

Пішу, высалапіўшы ад стараньня язык, друкаванымі літарамі, каб, крый Божа, чаго не пераблыталі.

Тэлеграфістка прачытала й пытаецца:

— А што такоя «віншую»?

— Поздравляю, — перакладаю я на мову нашай нацыянальнай меншасьці.

— Так бы і пісал. А Вінцэсь — эта што? Фамілія?

— Імя.

— Да нет такова імя, — гаворыць яна з сумесьсю ўкееленасьці й шкадобы. — Дурут тока галаву.

Тэлеграму яна ўсё ж прымае,



АРТУР ЛАГОДНЫ

Уладзімір Арлоў атрымлівае ад лідэра Руху “За Свабоду” Аляксандра Мілінкевіча ганаровую прэмію “За Свабоду думкі” (в. Бычкі, 26.06.2008г.)

ды потым высьвятляецца, што мае высілкі пайшлі тунна, бо тэкст, каб не пакрыўдзіць нацменшасьць, пераклалі «общепонятный». Дзякаваць Богу, што хоць ня сталася, як з адным мастаком, якому таксама пераклалі й замест паведамленьня пра хаўтуры атрымалася запрашэньне на «халтуру».

Праўда, гэткія пераклады рабіліся яшчэ ў БССРы. У сувэрэннай Рэспубліцы Беларусі новыя праблемы.

— Напішы унізу ціліграмы адрас і фамілію, — кажа паштарка.

Потым яна доўга й падазрона разглядвае блянк.

— Как фамілія? Арлой?

— Арлоў. На канцы — «у» кароткае.

— Нет такой буквы, — акурат, як у тэлеперадачы «Поле чудес», адразае паштарка.

Я — чалавек рахманы. Дастаю нататнік, малюю «й» і «ў» і даходліва тлумачу розьніцу.

Ня ведаю, дзе асела ў яе тое, што я ўтлумачваў, але ў галаве надзейна зачапілася, што я ўспадчыў ад бацькі незвычайнае найменьне — Арлой.

Заходжу наступнага разу ў аддзяленьне, і паштарка ўсьміхаецца

*— Што вы ўсё ходзіце? Там у вас яшчо какой-та Садовскій жывёт. Тожа ходзіт. Навыпісывалі журналав па-біларускі, а ціпер варуют адзін у аднаво із яшчыкав...*

мне, як старому знаёмаму, ды гукае нейкую Надзю.

— Арлой прышол, апяць журналы не данесьлі. Зь нетраў аддзяленьня выплывае раззлаваная Надзя.

— Што вы ўсё ходзіце? Там у вас яшчо какой-та Садовскій жывёт. Тожа ходзіт. Навыпісывалі журналав па-біларускі, а ціпер варуют




АРТУР ЛАГОДНЫ

ПРОЗА

адзін у аднаво із яшчыкав...

Недалёка ад пошты жыве крамяны дзядзька, зь якім нас збліжае тое, што ў яго таксама рэдкае мяно. У гістарычныя трыццатыя гады ідэёва загартаваныя бацькі ахрысьцілі сына Камінтэрнам. Ня ведаю, як было зь лексыкай у фірме, у гонар якой яго назвалі (мо там сыпалі выключна антыдзюрынгамі й пасылалі на эмпірыякрытыцызм), а ў нашага Камінтэрна ўлюбёнае слаўцо, перапрашаю, «блядзі».

Зноў адключылі на тыдзень гарачую ваду — «Блядзі!»

Паднялі кошт на гарэлку — «Што робяць, блядзі!»

Абвясьцілі Каляды выхадным днём — таксама «блядзі», але з адценьнем павагі.

Ня ведаю, што там чынілася ў балынавіцкім Камінтэрне, а наш дзядзька Камінтэрн — вечна нападпітку. Часам ён насмоктваецца да божае моцы й можа забурыцца проста пасярод дарогі.

— Зноў Камінтэрн напіўся, — кажуць тады жанчыны ў ягоным двары й просяць мужыкоў завалачы жлукту дахаты, бо дзядзька мае адметную рысу: заваліўшыся на дол, уяўляе, што ён ужо дома, і, палохаючы мінакоў, пачынае распранацца да майткоў.

У нашай Серабранцы ня менш цікавага, чымся ў Фолкнэравай Ёкнапатофе.

Але на сёньня я закругляюся, бо да мяне зрабіў візыт знаёмы мастак, і мы зь ім глынем кавы, а потым ён натхніцца й што-небудзь намалюе ў Нашай Ніве, і гэта разам з маёй пісанінаю выкліча ў часткі чытачоў новую порцыю здаровага абурэньня.

А таму, як звычайна кажуць у Ню-Ёрку, гуд бай!

Або, як звычайна кажуць у нас у Серабранцы, у Менску, у незалежнай Рэспубліцы Беларусі, до сьвіданьня!

Люты, 1992 г.



АРТУР ЛАГОДНЫ

СМІ ПРА НАС



Свіслач у раёне Серабранкі (Чыжоўскае вадасховішча) у дзень горада 9 верасня 2007 году

АРТУР ЛАГОДНЫ

# “А чаго ты вылупіўся?”

**Гэта толькі здаецца, што самымі актуальнымі пытаннямі з'яўляюцца “Хто вінаваты?” і “Што рабіць?”. На самай справе журналістам як шукальнікам адказаў на пытанні сучаснасці вельмі часта даводзіцца самім адказваць на вельмі злабадзённыя і вострыя пытанні.**

**2000 год, Беларусь, Мінск, мікрараён “Серабранка”**

У кампаніі намесніка рэдактара аднаго з рэспубліканскіх выданняў мы ў гэты дзень па-сапраўднаму адпачывалі. Нармалёва, з півам, на прыродзе, каля Свіслачы.

Планы былі выкшталцоныя: ззаду прырода, наперадзе – футбольная гульня Беларусь-Уэльс на стадыёне “Дынама”. Па шчырасці, мы пілі з самага ранку, але ж нікому не заміналі, нікога не чапалі – чэснае слова! Перыядычна Андрэй Алегавіч зацягваў песню “Чайфа”: “*А не спеть ли нам песню...?*” І сам жа адказваў: “А-а-а не спець!” І вось недзе да поўдня ў водблісках халоднага восеньскага сонца на суседнюю лаву прызямлілася парачка абарыгенаў. Вытрымкі і выхавання ў мясцовых аўтарытэтаў хапіла на паўтары бутэлькі гарэлкі. Пасля чаго ў наш адрас прагучала самае актуальнае ў Серабранцы пытанне: “А чаго ты вылупіўся?” (Далей ішла складаная і неперакладальная гульня словаў).

Андрэй Алегавіч, які з'яўляецца сур'ёзным аналітыкам, нават не стаў пазіцыянаваць пытанне адносна сябе. На жаль, яго спадарожнік аказаўся больш успрымальным да злабадзённых прэтэнзіяў, і аўтар серабранскага пытання хутка адчуў на сабе, што ўдары, як і шахматныя фігуры, бываюць розныя: белыя, чорныя, у галаву і па пячонцы.

Як і водзіцца ў цывілізаваным грамадстве, не прайшло і некалькіх хвілінаў, як на ўрэгуляванне пытання з'явіліся супрацоўнікі міліцыі. Без дай прычыны Андрэю Алегавічу ў будынку РУУС дасталася некалькі разоў дручком па розных частках цела. Ужо пад вечар, калі нас збіраліся адпускаць

*Як і водзіцца ў цывілізаваным грамадстве, не прайшло і некалькіх хвілінаў, як на ўрэгуляванне пытання з'явіліся супрацоўнікі міліцыі.*

на свабоду, намеснік рэдактара саліднай газеты паспрабаваў заглянуць у свой пэйджэр, каб даведацца вынік гульні Беларусь–Уэльс. “А чаго ты вылупіўся?” – з добрым выразам твару спытаў у яго дзяжурны міліцыянт. Нашы тады выйгралі 2:1.

**Мефодзій Валовіч**
**Інтэрнэт-выданне “Штотыднёвік”**

КРЫЖАВАНКА



**Уздоўж:** 1. Рынак у Серабранцы. 5. Вёска, якую Мінск паглынуў у 1959 г., але яе назоў застаўся на карце Серабранкі (часам пішацца з "й"). 8. Стыль, у якім узнаўляецца даўніна. 10. Шахматны "салдат". 11. Гук лісцяў увосень. 13. Асадачная горная парода; кладзецца на дарогу ў час рамонту. 14. Рух у страі. 15. Неразбярыха інакш. 17. Казацкі чын. 19. Слой глебы. 21. Брус на чыгуначным пуці. 23. Род баяна. 24. Народны мастак Беларусі; яго галерэя дзейнічае на праспекце Ракасоўскага. 26. Сыравіна для дыямента. 28. Новаабраны прэзідэнт ЗША. 29. Райцэнтр Гомельшчыны, даўні аплот стараабрадаў у Беларусі. 32. Сапраўднае прозвішча класіка яўрэйскай літаратуры Шолам-Алейхема (1859–1916). 35. "Жывы журнал" у Інтэрнэце. 37. Травяністая расліна з жорсткім сцяблом. 38. Балотная птушка, а таксама прозвішча гераічнага мінскага доктара ў час гітлераўскай акупацыі. 39. Плод цытрусавага дрэва. 40. Доказ невінаватасці. 41. Гулям … – герой вайны з Узбекістана, у гонар якога названая вуліца ў Серабранцы. 42. Лідэр незалежных прафсаюзаў, працуе ў Серабранцы.

**Упоперак:** 2. Паляўнічы-стралок. 3. Земляроб. 4. Савецкі шахцёр, "ударнік працы"; пра яго нагадваюць вуліца і завулак ля Трактарнага завода. 5. Настольная гульня; чэмпіёнамі свету ў ёй былі некалькі мінчан (А. Гантварг, А. Плакхін…). 6. Служыцель культу ў мусульман. 7. Маладое французскае віно. 9. Раён са славутым паркам, што мяжуе з Серабранкай. 10. Хваёвае дрэва. 12. Любімы зімовы від спорту в. а. прэзідэнта РБ. 15. Трактар, прыстасаваны для дарожных работ. 16. Расійскі багатыр; кіраваў чукчамі, прыглядаўся да беларусаў. 18. "Паселішча авіятараў" пад Мінскам. 19. "Не ткні носа ў чужое …" (прыказка). 20. Ручны вазок на адным коле. 22. Сінонім шапіка. 25. Паўднёвае дрэва з пахучымі кветкамі. 26. Гультай, лайдак (размоўнае). 27. Скрутак нітак, дроту. 30. Статак коней. 31. Непрафесіянал, любіцель. 33. Сусветна вядомы беларускі пісьменнік (1924–2003). 34. Рака, што нясе ваду Мінску з паўночнага захаду. 36. Настаўнік у індусаў. 37. Частка экскаватара.

**Адказы:**

Уздоўж: 1. "Свелта". 5. Шэпічы. 8. Рэтра. 10. Пешка. 11. Шорах. 13. Жвір. 14. Марш. 15. Блытаніна. 17. Есаул. 19. Пласт. 21. Рэйка. 23. Акардэон. 24. Шчамялёў. 26. Алмаз. 28. Абама. 29. Ветка. 32. Рабіновіч. 35. Блог. 37. Куст. 38. Кулік. 39. Лімон. 40. Алібі. 41. Якубаў. 42. Ярашук.

Упоперак: 2. Егер. 3. Араты. 4. Стаханаў. 5. Шашкі. 6. Імам. 7. Бажале. 9. Лошыца. 10. Піхта. 12. Хакей. 15. Бульдозер. 16. Абрамовіч. 18. Сокал. 19. Проса. 20. Тачка. 22. Кіёск. 25. Магнолія. 26. Абібок. 27. Маток. 30. Табун. 31. Аматар. 33. Быкаў. 34. Вілія. 36. Гуру. 37. Коўш.

**Склаў Вольф Рубінчык, г. Мінск**

МАСТАЦТВА

# Шчамялёў запрашае на сваё свята



АРТУР ЛАГОДНЫ

У мастацкай галерэі Леаніда Шчамялёва, што на Ракасоўскага, 49 (каля Шэпічаў) з 17 лютага адкрываецца выстава твораў майстра, прысвечаная ягонаму дню нараджэння.

Лепшыя карціны Леаніда Шчамялёва будуць сабраныя з прыватных калекцыяў, каб іх маглі пабачыць жыхары і госці Серабранкі. Мастак амаль 6 год свайго жыцця пражыў тут. Цалкам магчыма, што адмысловае серабранскае паветра, атачэнне, звычайны ды й псіхалагічны клімат раёна паўплывалі на станаўленне майстра, якому спаўняецца 86 год.

Да адкрыцця экспазіцыі, прысвечанай гадавіне мастака, у галерэі працуе выстава камп'ютэрнага фотакалажа Стася Герасімовіча і Уладзі Кандраценкі "Чуць і бачыць". Працы ў стылі "фэнтэзі", дзе чалавек і яго адзінота ў сучасным свеце перададзеная з дапамогай мастацкай фатаграфіі і камп'ютэрнай апрацоўцы – аснова экспазіцыі.

Прыемна адзначыць, што мастацкую галерэю Шчамялёва разам з музеем-майстэрняй Заіра Азгура (гэтыя дзве культурныя ўстановы апякуюцца Мінгарвыканкамам) у мінулым годзе наведала 18 тысяч чалавек, што на 4 тысячы болей за год папярэдні. Прыходзьце і Вы, шаноўны чытач. Галерэя працуе з 11 да 19 акрамя нядзелі і панядзелка. Кошты за квіткі сімвалічныя.

**А.Л.**

Мясцовае недзяржаўнае грамадска-палітычнае выданне "Вольная Серабранка"
Выдавец і заснавальнік – супольнасць дэмакратычных актывістаў Ленінскага раёна г. Мінска.
Друкуецца пры падтрымцы ЦВІ г. Мінска.
За змест матэрыялаў адказваюць аўтары.
Галоўны рэдактар – Артур Бацькавіч Лагодны.
**Пры выкарыстанні матэрыялаў і фотаздымкаў "ВС" спасылка абавязковая!**
Газета выдаецца на беларускай мове сучасным правапісам
Капіяванне газеты і распаўсюд сярод сваякоў і знаёмых вітаецца.
Інтэрнэт-старонка: http://serabranka.at.tut.by
Рэдакцыйны інтэрнэт-адрас: serabranka@tut.by
Лісты можна дасылаць на адрас: *Мінск, пр. Машэрава, 8 (Управа ПБНФ), для рэдактара "ВС"*
Рэдакцыйны тэлефон: (8-029)9625143
**РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА БЯСПЛАТНА**
Наклад 299 экз. (дадатковы 1). Замова № 19.
Падпісана да друку ў 0:01 18.02.2009 г.